Culture & Creativity
EU-Eastern Partnership Programme

# ІНІЦЫЯТЫВА «КРЭАТЫЎНЫЯ ГАРАДЫ І РЭГІЁНЫ»: ДАСЛЕДВАННЕ СВЕТЛАГОРСКА

Маргарыта Лазарэнкава

Праграма фінансуецца Еўрапейскім Саюзам

BRITISH COUNCIL · soros moldova · NATIONAL CENTRE FOR CULTURE POLAND · GOETHE INSTITUT

Праграма рэалізуецца кансорцыумам пад кіраўніцтвам Брытанскай Рады ў партнёрстве з Фондам Сорас-Малдова, Нацыянальным цэнтрам культуры ў Польшчы і Гётэ-інстытутам

*Даклад распрацаваны пры падтрымцы Праграма ЕС і Усходняга партнёрства «Культура і крэатыўнасць»*

*Змест гэтага дакладу не адлюстроўвае афіцыйнае меркаванне Еўрапейскага Саюзу. Адказнасць за выказаныя ў дакладзе інфармацыю і пазіцыю належыць цалкам яго аўтару.*

***Даклад апублікаваны ў верасні 2017 года.***

# ЗМЕСТ

**1. Уступ** Ошибка! Закладка не определена.

**2. Агляд Светлагорска** Ошибка! Закладка не определена.

**3. Ініцыятыва «Крэатыўныя гарады і рэгіёны» ў Светлагорску**Ошибка! Закладка не определена.

*3.1. Расклад праекта* ***Ошибка! Закладка не определена.***

*3.2. Каманда і зацікаўленыя бакі праекта* ***Ошибка! Закладка не определена.***

*3.3. Мапа крэатыўнага Светлагорска* *8*

*3.4. Гарадское ДНК Светлагорска* *9*

*3.5. Культурная інфраструктура і вітальнасць Светлагорска* *12*

**4. Агульныя рэкамендацыі для развіцця крэатыўнага патэнцыяла Светлагорска 13**

*4.1. Візія-2025* *13*

*4.2. Прыярытэты развіцця* *13*

*4.3. План дзеянняў на 2017-2020* *14*

# 1. УСТУП

Праграма ЕС і Усходняга партнёрства «Культура і крэатыўнасць» запусціла ініцыятыву «Крэатыўныя гарады і рэгіёны» з мэтай падкрэсліць важнасць культуры і творчасці ў малых і сярэдніх гарадах і рэгіёнах. Ініцыятыва прадстаўляе практычны падыход да выкарыстання мясцовага культурнага і творчага патэнцыялу на карысць сацыяльна-эканамічнага развіцця для гарадоў і рэгіёнаў у краінах Усходняга партнёрства.

Мэта ініцыятывы - павысіць інфармаванасць ўсіх ключавых зацікаўленых бакоў аб патэнцыяле культурных і творчых сектараў, сабраць дадзеныя аб мясцовых культурных і творчых рэсурсах і прапанаваць канкрэтныя планы дзеянняў для развіцця патэнцыялу культурных і творчых індустрый, у тым ліку развіцця мясцовага культурнага ландшафту, арганізацыі кластараў з мясцовымі прадпрыемствамі, павышэнне якасці прапановы турыстычнага сектара і стварэнне магутных сувязяў з аналагічнымі гарадамі і рэгіёнамі ў іншых краінах.

Па выніках ініцыятывы Праграма апублікавала дакумент «Максімальнае выкарыстанне культурных і творчых рэсурсаў: Кіраўніцтва па картаграфаванню і будаўніцтву стратэгіі для творчых гарадоў і рэгіёнаў», які даступен для бясплатнай загрузкі і можа забяспечыць практычнымі інструментамі і рэкамендацыямі па развіцці мясцовых рэсурсаў у гарадах і рэгіёнах [1].

# 2. АГЛЯД СВЕТЛАГОРСКА

У Беларусі для ўдзелу ў інцыятыве «Крэатыўныя гарады і рэгіёны» быў абраны Светлагорск. У параўнанні з іншымі пілотнымі гарадамі і рэгіёнамі праекта Светлагорск падаецца вельмі спрэчным выбарам на першы погляд. Гэта сярэдняга памеру горад на паўднёвым усходзе Беларусі з насельніцтвам каля 69 000 чалавек. Ён не мае ні багатай культурнай спадчыны, як Косаў (Украіна), ні ўнікальнага прыроднага ландшафту, як, напрыклад, у Сісіяне (Арменія). Тым не менш, гэта толькі павярхоўная выснова. Калі ўважліва прыгледзецца, вы знойдзеце яго схаваныя культурныя і творчыя скарбы.

Светлагорск з'явіўся на беларускай мапе ў 1961 годзе і па праве лічыцца самым маладым горадам Беларусі. Тым не менш, калі паглыбіцца ў тэму, вы можаце высветліць, што гісторыя гэтага горада не такая сціплая. Ён быў заснаваны на месцы пасёлка Шацілкі са сваёй старажытнай і цікавай гісторыяй, якая пачынаецца ў V-VI стагоддзі нашай эры. Пасёлак Шацілкі атрымаў сваю назву ад прозвішча беларускага двараніна Рамана Шацілы, які меў тут родавы маёнтак. У 2006 годзе падчас святкавання дня нараджэння горада на галоўнай плошчы быў усталяваны помнік заснавальніку горада.



[1] https://www.culturepartnership.eu/en/article/mapping-and-strategy-building-handbook

Паколькі Шацілкі выконвалі ролю мытні ў старажытныя часы, падчас раскопак тут былі знойдзеныя шматлікія артэфакты: нажы, трубкі для табаку, манеты і ўпрыгожванні. Усе яны зараз знаходзяцца ў светлагорскім гісторыка-краязнаўчым музеі.

У асноўным Шацілкі ўвесь час былі каталіцкім горадам.  У 1638 годзе ў Шацілках быў пабудаваны першы драўляны касцёл. Пасля некалькіх рэканструкцый і поўнага знішчэння савецкімі ўладамі ён быў адноўлены ў 1997 годзе. Зараз касцёл упрыгожвае набярэжную Бярэзіны і стаў «візітнай карткай» Светлагорска.

У 20-х гадах мінулага стагоддзя мясцовыя жыхары адкрылі арцель «Чырвоны суднабудаўнік», якая пасля ператварылася ў верф. У той час Шацілкі былі яркім шматнацыянальным мястэчкам з некалькімі габрэйскімі вуліцамі, якія, на жаль, былі знішчаныя разам з жыхарамі падчас Другой сусветнай вайны.

Пасля вайны ў 1961 году Шацілкі былі перайменаваныя ў Светлагорск з надзеяй на светлую савецкую будучыню палесскага рэгіёну. Насельніцтва горада расло хуткімі тэмпамі, маладыя спецыялісты добраахвотна прыязджалі сюды, зацікаўленыя ў працы на буйных прадпрыемствах «Светлагорскі цэлюлозна-шыферны камбінат» і ААТ «Светлагорскхімвалакно».

У 60-70-х гадах Светлагорск меў імідж горада будаўнікоў, хімікаў, энергетыкаў і моладзі. [2] У сярэдзіне 90-х, калі былі выяўленыя першыя выпадкі ВІЧ-інфікавання, вобраз горада рэзка змяніўся. Замест «горада моладзі і надзей» Светлагорск стаў асацыявацца з наркаманіяй, ВІЧ-інфекцыямі і смерцю. Аднак у сувязі з тым, што гарадское кам’юніці, у тым ліку мясцовыя СМІ, прыняла сур'ёзны ўдзел у вырашэнні праблем, узровень ВІЧ-пазітыўных выпадкаў сярод насельніцтва стабілізаваўся і выраўняўся з сярэднім па Беларусі.




2.Манумент на пад’ездзе да Светлагорска, 1970.

Мы бачым, як змянілася аблічча горада на працягу апошніх 50 гадоў, і можам зрабіць выснову аб тым, што сёння Светлагорск мае моцную патрэбу ў рэбрэндынгу і новым пазіцыянаванні на мапе Беларусі. Для таго, каб пераадолець

мінулыя негатыўныя канатацыі, горад павінен аб'яднаць свае інстытуцыйныя, дзяржаўныя і культурныя рэсурсы і сфарміраваць свой новы сучасны выгляд. Разуменне сучаснага гарадского ДНК Светлагорска (гл мал.3) можа быць першым крокам у стварэнні новага іміджу горада.

# 3. ІНІЦЫЯТЫВА «КРЭАТЫЎНЫЯ ГАРАДЫ І РЭГІЁНЫ» Ў СВЕТЛАГОРСКУ

Адміністрацыя Светлагорска падала заяўку на ўдзел у ініцыятыве «Крэатыўныя гарады і рэгіёны» па наступных прычынах:

- З мэтай высветліць, якія крокі трэба зрабіць, каб аднавіць годны імідж і прывабнасць Светлагорска;
- Мабілізаваць свае культурныя актывы і арганізацыі, уключыць грамадзян у рэалізацыю крэатыўнага патэнцыялу горада.

## *3.1 Расклад праекта*

| | |
|---|---|
| Снежань 2017 | • 9 беларускіх гарадоў і рэгіёнаў падалі заяўкі на ўдзел у праекце |
| Люты 2017 | • Светлагорск і 5 іншых гарадоў і рэгіёнаў з краін Усходняга партнёрства былі абраныя як пілотныя пляцоўкі |
| Сакавік 2017 | • аналітычнае даследаванне стратэгій, дакументаў і інтэрнэт-рэсурсаў |
| Красавік 2017 | • запуск праекта, адкрытая лекцыя Рагнара Сііла, брыфінг для зацікаўленых бакоў |
| Травень 2017 | • абмен досведам паміж 6-ю гарадамі-удзельнікамі на Форуме крэатыўных рэгіёнаў у Малдове |
| Травень 2017 | • філд-трып, наведванне лакацый, 5 фокус-груп (медыя-кампаніі, музей, фестываль, дзеячы культуры, аддзел культуры) |
| Чэрвень 2017 | •аналіз сабранага матэрыялу, распрацоўка рэкамендацый |
| Жнівень 2017 | • Адкрыццё першай крэатыўнай прасторы «Чердак», публічнае абмеркаванне ініцыятывы |
| Верасень 2017 | •прэзентацыя фінальнага дакладу і метадалогіі заяўнікам з Беларусі ў Мінску |

## *3.2 Каманда і ўдзельнікі праекта*

*Каманда праекта*

> **Лія Гелардзі** (Вялікабрытанія), Галоўны эксперт ініцыятывы «Крэатыўныя гарады і рэгіёны»;
> **Маргарыта Лазарэнкава** (Беларусь), Малодшы эксперт па Беларусі ініцыятывы «Крэатыўныя гарады і рэгіёны»;
> **Рагнар Сііл** (Эстонія), Ключавы эксперт Праграма ЕС і Усходняга партнёрства «Культура і крэатыўнасць»;
> **Аліна Дзеравянка** (Беларусь), Куратар Праграма ЕС і Усходняга партнёрства «Культура і крэатыўнасць»
> **Антон Кашлікаў** (Беларусь), Каардынатар праекта ў Светлагорску

*Удзельнікі даследавання (болей за 50 чалавек):*

> **Мясцовыя ўлады:** Пятроўскі Канстанцін Валер'евіч – намеснік старшыні раённага выканаўчага камітэта Светлагорска. Курыруе пытанні ідэалагічнай працы, адукацыі, культуры, фізічнай культуры, спорту і турызму, захавання і падтрымкі гістарычнай і культурнай спадчыны, міжнароднага партнёрства, працы з моладдзю, медыцынскіх паслуг, сацыяльнай абароны, сродкаў масавай інфармацыі, грамадскай працы, грамадскіх арганізацый.
> **Аддзел культуры:** Манкевіч Ала Віктараўна - начальнік аддзела па ідэалагічнай працы, культуры і справах моладзі райвыканкама Светлагорска. Забеспячэнне правядзення мерапрыемстваў з удзелам арганізацый культуры, творчых калектываў, грамадскіх і моладзевых арганізацый.
> **Медыя:** Важнявец Вадзім Аркадзьевіч – шэф-рэдактар медыя-кампаніі «Ранак». PR, камунікацыі, інфармацыйная падтрымка. Развіццё інфармацыйных і творчых праектаў. Аб'явы ў сродках масавай інфармацыі аб плануемых мерапрыемствах, кампетэнтнае асвятленне праекта і яго вынікаў на ўсіх этапах працы.
> **Бізнэс:** Кашлікаў Ігар Васільевіч - дырэктар медыя-кампаніі «Ранак». Функцыі кіравання культурным і каардынацыйным цэнтрам. Прадастаўленне тэхнічных і фінансавых рэсурсаў: мясцовыя тэлеканалы, радыёстанцыі FM-дыяпазону, газеты, шырокапалосная сетка перадачы дадзеных (Інтэрнэт, кабельнае тэлебачанне), інтэрнэт-рэсурсы, вонкавая рэклама, тэхнічнае абслугоўванне.
> **Грамадскія арганізацыі:** Бутырын Юрый Васільевіч - старшыня савета моладзевага грамадскага аб'яднання «Реальный мир». Уключэнне творча актыўных маладых людзей і грамадскіх арганізацый у рэалізацыю ініцыятывы. Удзел у распрацоўцы творчых праектаў. Каардынацыя ажыццяўлення дзейнасці.

# 3.3. Мапа крэатыўнага Светлагорска

Культурнае жыццё горада знаходзіцца, у асноўным, у цэнтры горада (гл мал. 4). Тут размешчаны галоўныя культурныя і арт-пляцоўкі, такія як галерэя «Традиция», гісторыка-краязнаўчы музей і галоўная прыродная славутасць - набярэжная ракі Бярэзіна. Сетка мясцовых дзяржаўных бібліятэк і некалькі кнігарняў таксама знаходзяцца ў цэнтральнай частцы горада.






У жніўні 2017 года, пасля некалькіх сустрэч з мясцовымі зацікаўленымі бакамі ў межах ініцыятывы «Крэатыўныя гарады і рэгіёны» на мапе Светлагорска з'явілася першая творчая прастора – медыя-хаб «Чердак». Пад час ініцыятывы ў хабе прайшлі першыя адкрытыя лекцыі і выстава.

Медыя-хаб «Чердак» – гэта прыватная ініцыятыва медыя-кампаніі «Ранак», знаходзіцца на паддашку будынка кампаніі. Унутры месцяцца прастора для правядзення выстаў, лекцыйная зала на 50 месцаў, асобная зала для правядзення круглых сталоў і ўтульная кухня для кава-брэйкаў.

Тут створаны сапраўды ўнікальныя для беларускіх СМІ ўмовы: лекцыйная зала абсталявана відэа і аўдыё тэхнікай, якая дазваляе любую падзею трансліраваць у прамы эфір на YouTube-канале або проста дакументаваць, каб у далейшым, напрыклад, распаўсюджваць запіс сярод жадаючых.

## 3.4. Гарадское ДНК Светлагорска

Прааналізаваўшы светлагорскую культурную інфраструктуру і яе жыццяздольнасць, становіцца відавочным, што Светлагорск знаходзіцца ў пачатку развіцця сваёй крэатыўнай эканомікі.Дзейнасць, звязаная з творчай індустрыяй, рэалізуецца ў асноўным у:

1. **Медыя і рэкламе** (акрамя медыя-кампаніі «Ранак» са сваім рэгіянальным ТБ, радыё і інтэрнэт-парталам, якія маюць вялікі ўплыў на горад, у Светлагорску існуюць таксама два высокаякасныя інтэрнэт-медыя-парталы);
2. **Аматарскім тэатры** (установы культуры прапаноўваюць моладзі шматлікія курсы па розных напрамках: жывапіс, спевы, харэаграфія і г.д., але што адрознівае Светлагорск ад іншых рэгіянальных цэнтраў, гэта 7 тэатральных студый, пачынаючы з тэатра ў дзіцячым садку «Василёк » і заканчваючы аматарскім тэатрам для дарослых «Авантюра»);
3. **Фэшн-дызайне** (фармальная адукацыя ў галіне фэшн-дызайну ў Светлагорскім дзяржаўным індустрыяльным каледжы і студыя моды «Divat», якая прадугледжвае нефармальную адукацыю ў гэтай сферы і праводзіць паказ мод ў Светлагорску);
4. Ёсць таксама некалькі мясцовых **крэатыўных бізнэсаў**, якія становўча ўплываюць на развіццё горада. Напрыклад, івэнт-агенцтва PARK, якое арганізоўвае першы прыватны летні фестываль «Jasmin».

Асноўныя праблемы і магчымасці культурнага і крэатыўнага сектароў, якія фарміруюць Светлагорскі гарадскі ДНК, прадстаўлены ніжэй:

**Гарадское ДНК Светлагорска**

**Людзі:**

*Цэнтр крэатыўнасці моладзі*

- **12 000** чалавек - аўдыторыя спажыўцоў культуры, маладзейшых за 18 гадоў;
- адкрытыя для дыялогу мясцовыя ўлады;
- актыўныя арт, тэатральныя, і рок-камьюніці, байкеры і ініцыятыўныя аўтаўлададальнікі;

**Месца:**

*Публічныя прасторы, якія натхняюць*

- зялёны гарадскі пейзаж;
- набярэжная Бярэзіны;
- цэнтральная плошча з мясцовым "Біг Бэнам"

**Эканоміка:**

*Высокі прадпрымальніцкі патэнцыял*

- **9** дзяржаўных градаўтваральных прадпрыемстваў ;
- **≈1500** індывідуальных прадпрымальнікаў,
- **≈450 маленькіх і сярэдніх прадпрыемстваў,** прыватная медыя-капманія, некалькі гатэляў і кафэ

**Інстытуцыі:**

*Традыцыйны погляд на культуру*

- **9**дзяржаўных культурных інстытуцый і **3** музеі і галерэі;
- Індустрыяльны каледж з напрамкам «фэнш-дызайн»;
- медыя-хаб «Чердак» як цэнтр нефармальных творчых актыўнасцяў;

Асноўным актывам горада з'яўляюцца, зразумела, людзі. З аднаго боку, Светлагорску пашанцавала мець прагрэсіўныя і адкрытыя для дыялогу ўлады, якія супрацоўнічаюць з прадпрыемствамі і НДА ў паляпшэнні горада. На працягу некалькіх гадоў светлагорскі муніцыпалітэт арганізуе арт-рэзідэнцыю для скульптараў і, як вынік гэтага праекта, шматлікія малыя архітэктурныя формы упрыгожваюць горад. З іншага боку, самі грамадзяне самі актыўна ўдзельнічаюць, ёсць некалькі ініцыятыву «знізу», якія ствараюць творчы рух ў Светлагорску, напрыклад, адкрытыя курсы беларускай мовы «Мова нанова» пад куратарствам маладога актывіста Дзяніса Рунца, ці праект «Роднае. Свае», запушчаны прыватнай медыя-кампаніяй «Ранак».

Светлагорск мае даволі актыўную мясцовую мастацкую супольнасць – у рэгіёне больш за 40 мастакоў. 12 з іх удзельнічаюць у штогадовай сумеснай арт-выставе «Светлогорский вернисаж», арганізаванай мясцовай мастацкай галерэяй «Традиция». Акрамя таго Светлагорск мае шырокую аўдыторыю для культурных і творчых мерапрыемстваў - каля 12 000 дзяцей і маладых людзей ва ўзросце да 18 гадоў жыве тут і актыўна ўдзельнічае ў шматлікіх мастацкіх і творчых клубах і курсах у горадзе. Такім чынам, горад мае ўсе магчымасці, каб стаць рэгіянальным цэнтрам моладзевай творчасці.

Наступны актыў, які можа быць выкарыстаны для Светлагорскага творчага развіцця, - гэта цэлы спіс натхняльных публічных месцаў, якія ідэальна падыходзяць для фестываляў на адкрытым паветры, вулічных арт-выстаў. Напрыклад, прыгожая набярэжная ракі Бярэзіны, дзе людзі любяць гуляць і бавіць свой вольны час, або цэнтральная плошча з мясцовым «Біг-Бэнам». Гэтыя месцы ўжо становяцца жывымі, напрыклад, падчас дзяржаўнага свята на Дзень горада. Тым не менш, ёсць яшчэ шмат месца для развіцця светлагорскіх публічных месцаў на працягу астатняй часткі года, як у летнім, так і ў зімовым сезоне.

З пункту гледжання турыста Светлагорск вельмі зялёны горад, у якім будаўнікі з павагай ставяцца да дрэваў. Дзякуючы гэтаму, у горадзе пануе расслабляльная атмасфера, мясцовыя жыхары называюць Светлагорск «горад-лес» і ганарацца тым, што маюць магчымасць збіраць ягады прама перад сваім домам. Існуе таксама гарадскі пляж на рацэ Бярэзіна, які можна выкарыстоўваць для актыўнага адпачынку і развіцця эка-турызму.

Асноўныя задачы для Светлагорска адносяцца да эканамічных і інстытуцыйных сфер. Асноўныя градаўтваральныя дзяржаўныя прадпрыемствы адчуваюць эканамічныя цяжкасці, у горадзе няма вышэйшых навучальных устаноў, і, хаця існуе даволі развітая сістэма нефармальнай адукацыі ў галіне мастацтва (9 дзяржаўных устаноў культуры і 7 дзяржаўных бібліятэк), іх дзейнасць заснавана на даволі традыцыйным падыходзе да культуры, мастацтва і рамяства.

Тым не менш гэтыя праблемы можна разглядаць як магчымасці. У эканамічнай сферы ёсць патэнцыял для развіцця прадпрымальніцтва: зараз у горадзе існуе больш за 1500 індывідуальных прадпрымальнікаў і каля 450 малых і сярэдніх прадпрыемстваў. Пры падтрымцы і правільных дзеяннях, накіраваных на развіццё прадпрымальніцкай дзейнасці ў горадзе, некаторыя свабодныя рынкавыя нішы могуць быць распрацаваны прыватным сектарам. Гэта, у сваю чаргу, акажа станоўчы ўплыў на развіццё горада. Напрыклад, сфера HORECA (гасцініцы, рэстараны, кафэ) неразвітая ў Светлагорску: ёсць толькі 2 гасцініцы, якія функцыянуюць больш-меньш паўнавартасна, адна кава-станцыя ў супермаркеце, няма «кава культуры», невялікая колькасць бараў і кафэ. Усе гэта прадастаўляе магчымасці для прадпрымальнікаў.

Інстытуцыянальнай сферы Светлагорска таксама не хапае прыватных ініцыятыў. У той час, як дзяржаўныя ўстановы культуры сканцэнтравалі ўвагу на традыцыйным падыходзе да мастацтва, існуе прастора для развіцця нефармальнай адукацыі ў творчых галінах для моладзевай аўдыторыі, якую можна было б арганізаваць на прыватнай аснове ў партнёрстве з развітай дзяржаўнай інфраструктурай і усімі яе культурнымі аб'ектамі. Ёсць ужо некаторыя паспяховыя прыклады. Такія як эксперыментальная тэатральная студыя «Ежик в тумане», якая выкарыстоўвае інавацыйныя метады выхавання моладзі на базе Светлагорскай дзіцячай школы мастацтваў.

Падсумоўваючы, Светлагорск з'яўляецца дынамічным горадам з высокім творчым патэнцыялам, схаваным ў шэрагах тыповых савецкіх панэльных дамоў. Яго гарадская ДНК складаецца з такіх моцных актываў як вялікая колькасць маладой

аўдыторыі і натхняльных публічных пastoraў. Аб'яднаўшы гэтыя рэсурсы, арганізацыйныя і эканамічныя праблемы могуць быць вырашаны, а новы вобраз горада можа быць сфарміраваны.

## 3.5. Культурная інфраструктура і вітальнасць Светлагорска

| **Колькасць** | |
|---|---|
| *канцэртных залаў* | **3** |
| *імпрэзаў на год* | каля **160** |
| *музеяў і галерэй* | **2галерэі і 1 музей**<br>Галерэя «Традиция»<br>Дом рамёстваў<br>Светлагорскі гісторыка-краязнаўчы музей |
| *кнігарняў* | **3** |
| *бібліятэк* | **7** |
| *лакальных медыя-каналаў* | **1** прыватная медыя-кампанія («Ранак» - ТБ, радыё, газета)<br>**1** дзяржаўная мясцовая газета і інтэрнэт-партал (N.sn.by)<br>**2** мясцовых інтэрнэт-медыя (Ranak.by, Lovesun.by) |
| *аб'ектаў культурнай спадчыны* | **1** –малюнак «Зямля Светлагорская» |
| *фестываляў* | **5 мясцовых фестываляў**<br>Моладзевы фестываль талентаў «Провинция»<br>Дзяржаўнае свята на Дзень горада<br>Фестываль на адкрытым паветры на гарадскім пляжы «На волне»<br>Прыватны фестываль «Jasmin» |
| *начных клубаў* | **1 начны клуб «Ягуар»** |
| *бараў і кафэ* | **6** |
| *нефармальных публічных прастораў* | **2** (медыя-хаб «Чердак» і НДА «Реальный мир») |
| *маладых спецыялістаў, якія прыдзджаюць у горад* | **220 выпускнікоў** |
| *тэатральных ініцыятыў* | **7 мясцовых тэатральных ініцыятыў**<br>Тэатр у дзіцячым садку «Василёк»<br>Музычны тэатр «Бумажная фантазия»<br>Студыя аперэты «Рампа»<br>Эксперыментальная тэатральная студыя «Ёжик в тумане»<br>Дзіцячая тэатр-студыя «Иголочки»<br>Народны тэатр «Спадчына»<br>Аматарскі тэатр «Авантюра» |

# 5. АГУЛЬНЫЯ РЭКАМЕНДАЦЫІ ДЛЯ РАЗВІЦЦЯ КРЭАТЫЎНАГА ПАТЭНЦЫЯЛУ СВЕТЛАГОРСКА

## *4.1. Візія-2025*

> Светлагорск вядомы ў Беларусі як «самы малады горад Беларусі» і рэгіянальны цэнтр моладзевай творчасці

*Паказчыкі: колькасць згадак ў сродках масавай інфармацыі, усё большая колькасць нефармальных мастацкіх і творчых адукацыйных курсаў, апытанні грамадзян, колькасць наведвальнікаў моладзевых мастацкіх фестываляў і конкурсаў*

> Светлагорск мае спрыяльныя ўмовы для развіцця творчага прадпрымальніцтва.

*Паказчыкі: колькасць творчых прадпрыемстваў, колькасць бізнэсаў у сферы HORECA (гасцініцы, рэстараны і кафэ), колькасць працоўных месцаў у медыя-вытворчасці і творчым сектары, аб'ём даходаў (ад падаткаў на прыбытак) у мясцовы бюджэт*

> Светлагорск з'яўляецца адкрытым і здаровым зялёным горадам з акцэнтам на зялёнай эканоміцы.

*Паказчыкі: паказчыкі міграцыі, узровень занятасці сярод моладзі, вынікі ВІЧ-скрынінгаў, колькасць грамадскіх экалагічных ініцыятыў, колькасць ініцыятыў зялёнай экономікі ў прамысловасці і энергетыцы, узровень удзелу грамадскасці ў экалогіі горада.*

## *4.2. Прыарытэты развіцця*

1. Развіццё моладзевай культуры

***1.1. Арганізацыя моладзевага аддзела культуры**, стварэнне працоўнай групы з удзельнікамі ва ўзросце **12-18** гадоў для распрацоўкі і ажыццяўлення ініцыятыў і мерапрыемстваў для моладзі ў галіне культуры і крэатыўных індустрый;*

***1.2. Запуск праграмы падтрымкі моладзевых фестываляў мастацтваў,** ключавыя прыярытэты: аматарскі тэатр, СМІ, мода;*

***1.3. Уключэнне моладзі ў развіццё горада:** запуск ініцыятыў, на манер European Youth Parliament, якія запрашаюць моладзь ствараць медыя-праграмы і блогі аб Светлагорску і г.д.*

2. Рэбрэндынг Светлагорску на мапе Беларусі

**2.1.** ***Гарадскі брэндынг:*** *запуск адкрытага конкурсу на стварэнне новага лагатыпа Светлагорска, прысвечанага дню нараджэння горада, для падтрымкі мясцовых дызайнераў і мастакоў.*

**2.2.** ***Дызайн публічных месцаў:*** *уключэнне мясцовай мастацкай супольнасці ў распрацоўку творчых дызайнерскіх рашэнняў, ініцыятыў вулічнага мастацтва для светлагорскай набярэжнай, цэнтральнай плошчы і г.д. падчас мерапрыемстваў у розныя сезоны;*

**2.3** ***PR-кампанія горада:*** *супрацоўніцтва з беларускімі і міжнароднымі сродкамі масавай інфармацыі, прасоўванне Светлагорска ў якасці творчага і здаровага горада, з добрай якасцю жыцця і аб'ектамі дабрабыту, даступнымі для ўсіх.*

3. Падтрымка крэатыўнага прадпрымальніцтва

**3.1.** ***Стварэнне мясцовага бізнес-інкубатара:*** *прадастаўленне прасторы для развіцця для мясцовых прадпрымальнікаў, маленькіх і сярэдніх прадпрыемстваў.*

**3.2.** ***Прадастаўленне магчымасцяў па нарошчванні патэнцыялу для творчага прадпрымальніцтва*** *і* ***запуск прапаноў па бізнес-адукацыі*** *на базе аднаго з каледжаў ў Светлагорску.*

**3.3.** ***Падтрымка прыватных ініцыятыў*** *у галіне культуры і творчых індустрый (стварэнне спіса існуючых аб'ектаў і іх паслуг, стварэнне спіса аб'ектаў нерухомай маёмасці, якія могуць быць выкарыстаны для патрэбаў мясцовых малых і сярэдніх прадпрыемстваў, пошук зацікаўленых у рэгіёне інвестараў).*

## *4.3. План дзеянняў на 2017-2020*

1. ***Запуск тэатральнага фестываля і/або аматараскага тэатральнага конкурса.*** *Стварыць працоўную групу па запуску Светлагорскага тэатральнага фестываля; распрацаваць канцэпцыю, прыярытэты дзейнасці, а таксама план дзеянняў на першы год. Пачаць з фандрайзінгу і партнёрстваў.*
2. ***Стварэнне аддзела культуры моладзі.*** *Запуск першай працоўнай групы маладых актывістаў, якія жадаюць прыняць удзел у культурным жыцці Светлагорска і палепшыць яго, выкарыстоўваючы свае творчыя і інавацыйныя ідэі. Пачаць з кароткатэрміновай працоўнай групы па пытаннях летняга сезону.*
3. ***Распрацоўка візуальнай ідэнтычнасці горада.*** *Арганізаваць адкрыты*

*конкурс на новы лагатып Светлагорска, прысвечаны дню нараджэння горада, для падтрымкі мясцовых дызайнераў і мастакоў.*

4. ***Супрацоўніцтва з беларускімі і еўрапейскімі СМІ.*** *Усталяванне партнёрскіх адносін з беларускімі і міжнароднымі сродкамі масавай інфармацыі ў двух асноўных кірунках: 1. Прасоўванне Светлагорска як творчага горада, 2. Супрацоўніцтва для стварэння будучай Моладзевай медыя-школы, якая будзе запушчана ў медыя-хабе «Чердак».*

# ЗАЎВАГА

Culture & Creativity
EU-Eastern Partnership Programme

*Даклад падрыхтаваны пры падтрымцы Праграмы ЕС і Усходняга партнёрства «Культура і крэатыўнасць». Змест гэтага дакладу не адлюстроўвае афіцыйны пункт гледжання Еўрапейскага Саюзу. Адказнасць за інфармацыю і высновы гэтага дакладу належыць цалкам яго аўтару.*

*Мэта Праграма ЕС і Усходняга партнёрства «Культура і крэатыўнасць» - падтрымаць ўклад культурнага і крэатыўнага сектараў ва ўстойлівае гуманітарнае, сацыяльнае і эканамічнае развіццё ў Арменіі, Азербайджане, Беларусі, Грузіі, Малдове і Украіне.*

The Programme is funded by
the European Union